**Кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта**

**запрашае на Міжнародную навуковую канферэнцыю**

# Польска-беларускія літаратурныя, гісторыка-культурныя і моўныя сувязі

## ( Да 100-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі )

**16 -17 сакавіка 2018 года, Варшава**

Планаваная канферэнцыя, падобным чынам як і папярэднія з гэтага цыкла, адбудзецца пад знакам супольнай польска-беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, літаратурных і моўных сувязяў, гэта значыць таго, што аб’ядноўвае нашыя народы. Моўнае і культурнае суседства вядзе да свайго роду дыялогу, узаемадзеяння, інтэграцыі і ў выніку да ўзнікання новых, адметных каштоўнасцяў. У сваю чаргу захаванне спадчыны продкаў, зберажэнне традыцый стварае культурную самабытнасць супольнасці, якая складаецца з матэрыяльнай спадчыны продкаў, а таксама выпрацаваных імі мадэляў паводзінаў і сістэмы каштоўнасцяў.

Лёсы беларусаў і палякаў на працягу многіх стагоддзяў перакрыжоўваліся, надаючы новыя імпульсы, стымулюючы новыя ўяўленні і творчы патэнцыял. Многія вядомыя польскія нацыянальныя дзеячы, пісьменнікі і мастакі нарадзіліся на землях сучаснай Беларусі, а беларускія – у межах польскай дзяржавы, што заахвочвае даследчыкаў па абодва бакі ад мяжы да новых творчых пошукаў і новага погляду на польска-беларускія адносіны.

Даследчыкі з Польшчы, Беларусі і іншых краін будуць мець магчымасць прадставіць апошнія навуковыя дасягненні на пленарным пасяджэнні, а таксама

падчас працы ў трох секцыях: літаратуразнаўчай, мовазнаўчай і гісторыка-культуразнаўчай.

Плануюцца 20-хвілінныя пленарныя выступленні і 15-хвілінныя выступленні ў секцыях.

Мовы канферэнцыі: беларуская і польская.

Заяўку на ўдзел у канферэнцыі просім даслаць да 01.02.2018 на адрас электроннай пошты арганізатараў **konferencjakb@gmail.com**

У заяўцы неабходна пазначыць кантактныя дадзеныя і прапанаваную тэму рэферата.

Выдаткі на праезд, пражыванне, харчаванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

Арганізацыйны ўзнос складае 400 злотых, для ўдзельнікаў з Беларусі - 35 еўра і ўключае ў сябе: аплату за ўдзел у канферэнцыі, публікацыю артыкула, урачыстую вячэру і кава-паўзы.

Існуе магчымасць забраніраваць месца ва ўніверсітэцкай гасцініцы 15, 16, 17 і 18 сакавіка. Адно месца ў аднамесным нумары каштуе 135 злотых, у двухмесным – 95 злотых, у трохмесным – 90 злотых за суткі альбо 45 злотых за суткі ў трохмесным нумары ў студэнцкім інтэрнаце (пакой без выгод). Зацікаўленых просім паведаміць пра даты і колькасць начлегаў

Плануецца публікацыя артыкулаў у пунктаваным часопісе „Acta Albaruthenica”.

**Арганізатары:**

**праф. Ніна Баршчэўская**

**праф. Мікалай Хаўстовіч**

**др Вольга Трацяк**

**др Анна Рэндзёх-Коркуз**

**др Радаслаў Калета**

**мгр Марыля Хаўстовіч**

**мгр Анна Сівірска**


Katedra Białorutenistyki
Uniwersytetu Warszawskiego
ul. Szturmowa 4
02-678 Warszawa
tel. **(0 22) 55 34 22**